# З ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫЯЙ НА ЧАЛЕ

**Ц. КІСЯЛЁЎ**
**Сакратар ЦК КПБ**

Урачыста і радасна адзначае беларускі народ знамянальныя даты ў сваёй гісторыі — 40-ю гадавіну стварэння БССР і саракагоддзе ўтварэння свайго баявога авангарда — Камуністычнай партыі Беларусі — неад'емнай састаўной часткі вялікай і слаўнай КПСС. Працоўныя рэспублікі з гордасцю аглядаюць пройдзены шлях. За сорак год Савецкай улады Беларусь дасягнула ў братняй сям'і народаў магутнага Саюза ССР выдатных поспехаў на ўсіх участках камуністычнага будаўніцтва.

У пярэдадзень свята Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка за пасляваеннае аднаўленне разбуранай у перыяд вайны народнай гаспадаркі і вялікія дасягненні ў далейшым развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры ўзнагароджана ордэнам Леніна. Працоўныя рэспублікі з велізарнай радасцю сустрэлі паведамленне аб узнагароджанні і бязмежна ўдзячны Цэнтральнаму Камітэту КПСС, Савецкаму ўраду за такую высокую ацэнку іх працы.

Беларускі народ не пашкадуе сваіх сіл, каб і ў далейшым з яшчэ большай энергіяй самааддана працаваць на карысць сацыялістычнай Радзімы, у імя перамогі камунізма ў нашай краіне.

* * *

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка была створана працоўнымі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і яе правадыра У. І. Леніна. 30—31 снежня 1918 года праходзіла VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), якая, выказваючы волю і спадзяванні беларускага народа, прыняла гістарычнае рашэнне аб стварэнні Беларускай Савецкай дзяржавы. 1 студзеня 1919 года быў апублікаван Маніфест Часовага Рэвалюцыйнага Рабоча-Сялянскага Урада Беларусі, які аб'явіў стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Дзень апублікавання Маніфеста і стаў днём нараджэння БССР. Усе мерапрыемствы па стварэнню Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі праводзіліся па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам ЦК РКП(б). Стварэнне БССР, як і іншых савецкіх рэспублік, з'явілася трыумфам ленінскай нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі.

Так упершыню за ўсю шматвяковую гісторыю беларускі народ набыў сваю нацыянальную незалежнасць і дзяржаўнасць, стаў паўнапраўным гаспадаром свайго жыцця.

Пасля перамогі Вялікага Кастрычніка Уладзімір Ільіч Ленін распрацаваў навукова абгрунтаваную праграму ператварэння эканамічна адсталай Расіі ў перадавую магутную сацыялістычную дзяржаву. Цяжка пераацаніць значэнне ленінскіх прадвызначэнняў для лёсу беларускага народа, як і для лёсу ўсіх іншых народаў нашай краіны. Ажыццяўленне ленінскага плана пабудовы сацыялізма азначала сапраўды грандыёзны скачок ад адсталасці да прагрэсу.

Сваё настрымнае імкненне за найкарацейшы тэрмін пераадолець тэхніка-эканамічную адсталасць і разруху, стварыць высакаразвітую эканоміку і перш за ўсё буйную прамысловасць працоўныя наглядна прадэманстравалі ўжо з першых дзён будаўніцтва новага жыцця. У авангардзе будаўнікоў сацыялістычнага грамадства ішлі камуністы.

Найвялікшае значэнне для вырашэння задач сацыялістычнага будаўніцтва, для лёсу народаў нашай краіны мела стварэнне ў снежні 1922 года Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, натхніцелем і арганізатарам якога быў У. І. Ленін. Уступленне Беларусі ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з'явілася выдатным актам у развіцці яе дзяржаўнасці і ўмацаванні яе суверэнітэту. Наступны гістарычны вопыт паказаў, якім жыццёва неабходным для Беларусі з'явілася ўваходжанне яе ў склад Саюза ССР.

* * *

Велізарныя змены ў жыцці беларускага народа, як і іншых народаў Савецкага Саюза, адбыліся ў выніку ажыццяўлення Камуністычнай партыяй палітыкі сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. На гэтай аснове было скончана з адсталасцю, атрыманай у спадчыну ад мінулага. Беларусь, як і іншыя братнія нацыянальныя рэспублікі, ператварылася ў рэспубліку высакаразвітай індустрыі і буйнай калектыўнай сельскай гаспадаркі.

Дзякуючы клопатам Камуністычнай партыі і Саюзнага ўрада, пры братняй дапа-

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы